У обучающегося в высшем учебном заведении закладываются основы второго и третьего компонентов профессиональной концепции, конкретизирующиеся затем в труде [3].

Профессиональная направленность становится важнейшей в личностной направленности не только подростка, но и молодого человека, определяет его интересы, склонности, убеждения, идеалы. Проще говоря, профессиональная направленность диктует стиль жизни, распределение свободного времени, выбор чтения, приобретение знаний, интерес к определенным учебным предметам, предпочтения в общении и тому подобное, а главное – выбор профессии (сферы деятельности) по призванию.

Таким образом, профессиональная направленность является самостоятельной областью знания, но формируется на стыке педагогики, психологии, социологии, экономики, философии, медицины и права. Профессиональная направленность трактуется как совокупность мотивов, установок, интересов, склонностей личности, планов, ценностных ориентаций в области определенной профессиональной деятельности. Изучение проблемы формирования профессиональной направленности у студентов позволит повысить мотивацию к изучению специальных дисциплин.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Карнаухов, В. А. Мотивационно-смысловые образования в структуре направленности личности / В. А. Карнаухов. – Белгород: Изд-во БелГУ, 2002. – 71 с.

2. Никиреев, Е. М. Направленность личности и методы ее исследования / Е. М. Никиреев. – М. – Воронеж, 2004. – 54 с.

3. Чуркин, С. Д. Профессиональная направленность и карьерные ориентации студентов различных факультетов / С. Д. Чуркин, Т. Д. Дубовицкая, Е. Б. Маслов // Современные проблемы науки и образования. – 2012. – № 2; Режим доступа: www.science-education.ru/102-5882 (дата обращения: 25.09.2014).

УДК 94:332.54(476.6)

# СТАН ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ НА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ ПАВОДЛЕ РЭФЕРАТА ІОСІФА ЗЕМБЛІСА

**Галубовіч В. У., Радзюк А. Г.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Узровень і перспектывы развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў Гарадзенскай губерні на пачатку XX ст. знаходзіліся пад пільнай увагай мясцовага грамадства. Да найбольш заўважных грамадскіх

ініцыятыў таго часу належыць аднесці стварэнне сельскагаспадарчых таварыстваў. Такое таварыства на Гарадзеншчыне (ГТСГ) пачало функцыянаваць у 1901 г. Адной з мэтаў гэтай арганізацыі стала прапаганда рацыянальных метадаў вядзення гаспадаркі, таму на пасяджэннях таварыства рэгулярна выступалі з паведамленнямі спецыялісты-аграрыі. Некаторыя даклады мелі даволі шырокі грамадскі рэзананс, і з імі можна было азнаёміцца нават у прэсе. Уласна такі вынік мела выступленне на агульным сходзе ГТСГ губернскага інструктара па малочнай гаспадарцы і жывёлагадоўлі ***Іосіфа Казіміравіча Земbліса*** 4 лістапада 1904 г. Тэкст гэтага выступу стаўся нагэтулькі запатрабаваным, што быў перадрукаваны ў трох выпусках "***Гарадзенскіх губернскіх ведамасцей***" у 1905 г. (№15-17 ад 8, 16 і 29 красавіка), праўда з адметнай агаворкай "***Перадрук забаронены***" (невядома, па жаданні аўтара ці з ініцыятывы рэдакцыі). Рэферат І. Зембліса з'яўляецца, па сутнасці, спробай дыягностыкі стану развіцця малочнай гаспадаркі па выніках наведвання "*некаторых мясцін губерні*".

Першая частка рэферата была прысвечана аналізу становішча жывелагадоўлі і метадам яе ўдасканалення. Інспектар звярнуў увагу на тое, што ў губерні ёсць шэраг маёнткаў, стан малочнага статку ў якіх, з пункту гледжання прадукцыйнасці, экстэр'ера і здароўя, быў "*даволі добрым*". Да іх ліку ён аднёс маёнтак пана Рота "Вярховічы", дзе меўся статак швіцкай пароды, маёнтак пана Скірмунта "Моладава", дзе малочную прадукцыю атрымлівалі ад сіментальскай пароды, а таксама маёнткі князя Пузыны "Стрыгава" і пана Мікульскага "Літва", дзе прадукцыю атрымлівалі ад кароў галандскай пароды.

Вельмі негатыўна інструктар па малочнай гаспадарцы ацаніў арганізацыю "*скрыжавання жывелаў*", якая ў губерні адбывалася фактычна наўздагад.

На думку І. Зембліса, лепшымі сродкамі ўдасканалення мясцовай жывёлы ў Гарадзенскай губерні з'яўляюцца: а) прыліпія крыві; б) старанны падбор племянной жывёлы; в) правільнае гадаванне прыплоду. Падбор племянных малочных кароў належала рабіць на аснове рэгулярнага кантролю за ўдоем (мінімум 8 разоў за месяц) і тлустасцю малака. Пры гэтым трэба было звяртаць увагу на прыкметы малочнай прадукцыйнасці, сярод якіх вылучалася наступнае: "*каровы павінны выяўляць жаночасць, якая найбольш відавочная ў формах галоў*". У рэфераце адзначалася, што вытворнікі абавязкова павінны паходзіць ад малочных кароў.

Таксама І. Зембліс настойліва рэкамендаваў заводчыкам жывёлы скарыстацца выгодамі спецыялізацыі і займацца на выбар малочным,

малочна-мясным, мяса-малочным накірункам ці гадаваннем прыплоду. Шматпрофільнасць ім не ўхвалялася.

Асобная ўвага інструктарам надавалася стараннаму вырошчванню прыплоду, без чаго "*пакладзеную працу па ўдасканаленні якасці жывёлы страцім беззваротна*". З уласнага досведу і практыкі нямецкіх, дацкіх і швейцарскіх вытворцаў аўтар раіў трымаць цялят пад першацёлкамі і маламалочнымі каровамі, каб больш развівалася вымя і адпаведна карова давала больш малака. Ад малочных кароў, наадварот, цяля належала адлучаць. Пры трыманні цялят пад каровай іх патрабавалася размяшчаць у асобным памяшканні і дапускаць да маці на працягу першых 8 дзён 5 разоў у суткі, наступныя 8 дзён 4 разы, а яшчэ праз 8 дзён – тры разы. Пазней належала тлустае малако замяняць худым у комплексе з ільняным алеем (на 1 літар – 32 г) і так карміць да 9 тыдняў. На 10-ты тыдзень цялятки мусілі атрымліваць сена, крышаны авёс і ільняную макуху разам з фосфарна-кіслай вапнай (на 1000 пудоў вагі – 12-14 г). Спасылаючыся на досвед амерыканцаў, І. Зембліс сцвярджаў, што рацыянальнае кармленне жывёлы заключаецца ў тым, каб "*корм утрымліваў у сабе ўсе тыя рэчывы, з якіх складаецца яе арганізм*". За выключэннем натрыя, хлора і фосфара-кіслай вапны, усе іншыя элементы ў кармах звычайна прысутнічаюць. Таму рэкамендавалася дадаваць да корму солі (NaCl) – 15-60 г на 1000 пудоў жывой вагі.

Працяг рэферата быў апублікаваны ў № 16 "***Гарадзенскіх губернскіх ведамасцей***" з пэўным цікавым дадаткам ва ўступе: "*Што будзе рабіць адмірал Ражджэсцвенскі*".

У гэтай частцы інспектар І. Зембліс найперш выклаў сваё бачанне прычын, якія перашкаджалі развіццю жывёлагадоўлі ў Гарадзенскай губерні. Да іх ліку было аднесена наступнае: 1) недахоп добрых поплаваў і пашаў, іх некультурны стан. Паколькі асобныя ўладальнікі не мелі магчымасці праводзіць меліярацыйныя работы, І. Зембліс канстатаваў, што ёсць патрэба ў дзяржаўнай дапамозе ў выглядзе "*меліярацыйнага крэдыту*"; 2) недахоп вытворнікаў і матак, з-за адсутнасці сродкаў у землеўладальнікаў. Выйсце бачылася ізноў жа ў адкрыцці крэдытаў для адпаведных мерапрыемстваў; 3) празмерная разнастайнасць парод у губерні, што было вынікам браку "*элементарных звестак па жывёлагадоўлі*"; 4) поўная адсутнасць кваліфікаваных пастухоў і скотнікаў; 5) утрыманне каштоўных парод жывёлы ў неадпаведных умовах; 6) неразуменне карысці ад жывёлагадоўлі; 7) адсутнасць салідарнай працы; 8) вываз вотруб'я і макухі за мяжу; некультурнасць насельніцтва; 9) утрыманне служачымі кароў у маёнтках; 10) жыды, якія паралізавалі ўсялякую

самастойнасць і працу абшарнікаў. Адметна, што апошняя прычына была названа “*адной з самых важных*”.

Пры ўсёй незадавальняючай характарыстыцы стану жывёлагадоўлі І. Зембліс, тым не менш, знаходзіў падставы да аптымізму. Так, вельмі станоўчую адзнаку ў рэфераце атрымалі мерапрыемствы па паляпшэнні пашы ў маёнтку Аляксея Азнабішына “Новая Квасоўка”.

Для выпраўлення сітуацыі, паводле меркавання інспектара, у губерні належала адчыніць па меншай меры дзве школы даглядчыка жывёлы. Да неадкладных мерапрыемстваў І. Зембліс аднёс адхіленне жыдоў ад арэнды жывёлы. Нескладанай арыфметыкай аўтар даводзіў, што землеўладальнікі застаюцца ў палоне экстэнсіўнай гаспадарчай практыкі, пры якой “*яны не звяртаюць увагу на якасць і стан*” кароў, а карыстаюцца паслугамі жыдоў-маслабойшчыкаў, звыклых працаваць не ад якасці, а ад колькасці.

Экстэнсіўнасць мясцовай малочнай гаспадаркі дазволіла канстатаваць, што гэтая галіна сельскагаспадарчай вытворчасці з’яўляецца “*гнойнай машынай, як гэта было ў Даніі, Швейцарыі, Германіі і іншых цывілізаваных краінах некалькі дзесяцігоддзяў таму*”. Мясцовым землеўладальнікам для рашучых зменаў не хапала галоўнага – *мужнасці і стараннасці*.

Далей І. Зембліс прадставіў каштоўныя развагі адносна праблемы ўмоваў утрымання жывёлы. Так, на яго думку, эканамічна больш мэтазгодна звярнуць увагу на мясцовыя пароды кароў, якія пры ўмове лепшага дагляду, пра што сведчыў вопыт гаспадарак Навагрудскага павета, маглі б аддзячыць больш шчодра за дагляд, чым “*скот любой культурнай пароды*”. Аўтар прыводзіў наступныя дадзеныя: кошт галандскай каровы складаў 200-500 рублёў, а мясцовай 40-75 рублёў; галандка давала ад 160 да 200 вядзёр, а мясцовая – 80-100. Аднак, улічваючы тое, што галандскія каровы спажывалі корму ў тры разы больш за мясцовых, атрымлівалася, што малако ад іх выходзіла больш дарагім. Не менш істотнай акалічнасцю на карысць айчынных парод з’яўлялася іх меншая ўспрымальнасць да хвароб, у той час як галандская жывёла была схільная да сухотаў, а нямецкая – суцэльна падлягала запаленню лёгкіх.

Складанае пытанне пра выбар пароды для развядзення І. Зембліс узалежніў ад агульнай мэты гаспадаркі і якасных паказнікаў самой пароды. Так, ён лічыў мэтазгодным утрымліваць галандскі скот у прыгарадных гаспадарках, якія збывалі неразведзенае малако. Добрым прыкладам такой спецыялізацыі быў маёнтак князя Пузыны “Стрыгава”, дзе ўдой сягаў 900 гарнцаў. Швіцкая парода давала

добрыя паказнікі ў гаспадарках, якія спецыялізаваліся на вырабе масла (маёнтак "Вярховічы" пана Рота), для чаго патрабавалася малако тлустасцю 3,5-4%. Таксама і сіметальская парода някепска сябе зарэкамендавала ў маёнтках, дзе выраблялі масла (маёнтак "Моладава" пана Скірмунта).

Пры паляпшэнні мясцовай пароды за кошт замежных парод І. Зембліс настойваў на тым, каб такая жывёла была народжаная ў Расійскай імперыі.

Нарэшце, у апошняй частцы свайго рэферата губернскі інспектар звярнуўся да агульнай характарыстыкі малочнай гаспадаркі, дзе збольшага паўтарыў выказаныя вышэй развагі і назіранні. Ключавым стаў тэзіс пра залежнасць якаснай прадукцыі ад кваліфікацыі спецыялістаў у галіне малакаперапрацоўкі. Цікава, што губернскі інспектар адзначаў, што масла першага і другога гатунку было выключэннем для сучаснай яму вытворчасці.

Ізноў жа паўтараючы тэзіс пра незадавальняючы стан малочнай гаспадаркі, на гэты раз на прыкладзе стану памяшканняў і тэхнікі вытворчасці, І. Зембліс прызнаў наяўнасць у губерні перадавых прадпрыемстваў. Такімі ён лічыў паравыя маслабойні ў маёнтку графіні Бобрынскай "Закозель" і "Булькава" барона Энгельгардта.

Пастаўленыя ў рэфераце праблемы І. Зембліс лічыў "*невырашальнымі*", хаця ён і паабяцаў прыкласці ўсе магчымыя намаганні з свайго боку.

У цэлым адзнаку ўзроўня развіцця малочнай гаспадаркі Гарадзенскай губерні, якую зрабіў інспектар І. Зембліс, трэба прызнаць дастаткова крытычнай, але аб'ектыўнай. Пры дамінацыі, у цэлым негатыву, у рэфераце прысутнічае і пэўны пазітыўны пасыл, які выяўляўся ў закліках арыентавацца на лепшыя ўзоры арганізацыі вытворчасці, дэкляраванні наяўнасці магчымасцяў для пераадолення комплекснага адставання ад перадавых краін.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Гродненские губернские ведомости. 1905 г. 8-29 апреля. №15-17.
2. Jurkowski, R. Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864-1904. Działalność społeczno-gospodarcza. Warszawa: Drukarnia Duo, 2001.